# КАЦЯРЫНА КАВАЛЕЎСКАЯ

## Тры апавяданні



Кавалеўская-Ахматава Кацярына нарадзілася 11 верасня 2005 года ў горадзе Слоніме Гродзенскай вобласці. Вучыцца на філалагічным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Упершыню ў «Маладосці».

### Мама

Чорны Mustang спыніўся ля старой хаткі ў канцы вуліцы. Драўляны плот зусім перакасіўся, счарнеў, парос імхом. Кабеты, што цягнуліся дарогай, заўважылі машыну і чужынца. Яны не маглі зразумець, з якой нагоды ў іх мястэчка мог прыехаць такі аўтамабіль.

Мужчына закурыў. Агеньчык выпаўз з гравіраванай запальнічкі. Драўляная брамка скрыпнула за мужчынам, ён не змог яе зачыніць, і яна няроўна павісла на ржавай пятлі. Праходзячы каля акна да ўвахода, заўважыў на падаконні свечку. Маці заўсёды ставіла такую, калі хтосьці паміраў. Ён падняў руку, каб пагрукаць, але ў апошні момант апусціў яе. Пачакаў пару секунд і ўвайшоў. Яго ахутаў пах воску, каліва і цвілі. У цемры навобмацак знайшоў выключальнік. Цьмянае святло ледзьве асвятліла старую пацёртую падлогу, аблезлыя шпалеры і фотаздымкі. На адным ён пазнаў сябе. Рудога і малога. Быццам нават шчаслівага. На лбе выступіў пот, а па яго скуры прабеглі дрыжыкі. Ён прайшоў па калідоры і звярнуў у пакой.

Бабкі, якія сядзелі справа ля сцяны і галасілі малітвы, замоўклі. Яго сястра, што ўкленчыла ля труны, з жахам падняла сівую галаву.

— Хто прыехаў! Вы паглядзіце, у якім паліто! Не дачакалася старая свайго любімага! Хах! Здохла! — засмяяўся яго старэйшы брат. Ён сядзеў у кутку ў старым падрапаным шынялі. На стале стаяла пляшка. Абрубленая нага была абматаная бруднымі шэрымі анучамі. Чырвоныя шкляныя вочы выкочваліся з арбіт, з рота лілася сліна.— Думаеш, яна пазнала б цябе? Га-га-га! Не дачакалася любімага!

— Змоўкні! Богам малю! — крыкнула сястра, упаўшы на падлогу. Пакой заліўся выем.

— *Господи, помилуй, Господи, помилуй, Господи, помилуй, Господи, помилуй, Господи, помилуй, Господи, помилуй...*— зацягнулі плакальшчыцы.

— Кінула ты нас, Юстынка... Харошая баба была...—ківала адна. Яе хустка з'ехала

# НАДЗЕЯ СКРЫПНІК



## Твой Шпілеўскі

Апавяданне

Скрыпнік Надзея нарадзілася 1 студзеня 1977 года ў горадзе Любань Мінскай вобласці. Скончыла Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка і Акадэмію паслядыпломнай адукацыі. Працуе настаўнікам англійскай мовы ў вясковай школе. Любіць слухаць рок-оперы і мюзіклы, калекцыяніруе кубкі для гарбаты з назвамі гарадоў і краін. Піша песні для ўзорных дзіцячых калектываў. Тройчы лаўрэат конкурсу біяграфічных твораў «Слаўная кампанія: рэANIMAцыя».

Гумба не пісаў ужо трэці месяц, і гэта аказалася сур'ёзнай праблемай. Штораніцы ён адкрываў ноўтбук, бачыў перад сабой пусты аркуш на экране і бяздумна тарашчыўся ў яго некалькі гадзін. Псіхаваў, мацюкаўся, пасля са злосцю закрываў. Спраўна хлусіў выдаўцу, што стабільна раз на тыдзень нагадваў кароткім мэсэджам аб тэрмінах.

«Я люблю дэдлайны, я люблю дэдлайны, я люблю... — паўтараў звыклую мантру Гумба, шукаў у календары крайнюю дату і на нейкі час супакойваўся.— Яшчэ не заўтра. Паспею».

Гумба быў з тых аўтараў, якіх рэгулярна выдавалі, прычым ён не траціў ні капейкі з уласных грошай. Яго любілі рэдактары, абагаўлялі чытачы, а палкія дзяўчыны пісалі яму ў дырэкт Instagram, адпраўляючы галасавыя з прызнаннем у каханні. Часам Гумба іх нават праслухоўваў.

«Што паробіш, гэта неабходнае зло. Я прэзентую ім прыгожыя казкі, яны — сваё каханне. Нічога асабістага — проста жыццё папулярнага чалавека».

Зрэшты, Гумба нікога ніколі не кахаў, ён карыстаўся дарамі і заставаўся верным толькі сабе.

«Калі пачуццё дапаможа прыдумаць выдатную гісторыю, то я, натуральна, адкрыты для прапаноў».

Гісторыі ў яго атрымліваліся.

Гумба любіў Беларусь і ведаў яе даволі добра. Напісаныя ім містычныя сагі выклікалі ў чытача асаблівае хвалянне, што дадавала ў кроў дастатковую дозу адрэналіну, які не дазваляў адарвацца ад тэксту. Яго творы чыталі з азартам да самай раніцы, нікога не хвалявалі ранні пад'ём на працу або вучобу. Чытачу хацелася разабрацца ва ўсіх хітрыках містычнага опуса, звязаць ніткі сюжэта, што выслізгвалі, стрэліць з усіх развешаных аўтарам стрэльбаў.

Гумба любіў паўтараць, не хаваючы нетыповую радасць: «Відавочна, я спец па

еўрапейскай міфалогіі і магу скрыжаваць такое — місіс Джоан Р. пойдзе за вугал паплакаць і нервова пакурыць. Калі ў беларускія міфы дадаць скандынаўскага трымцення, старажытнагрэцкай рамантыкі, падфарбаваць мікс кармінам або фуксіяй з якой-небудзь румынскай Валахіі, напішацца маё любімае. І, дарэчы, ваша любімае таксама. Вы атрымаеце незабыўнае чытво на некалькі начэй, я — смачны ганарар, і ўсе застануцца задаволенымі. Гэта падобна на бясконцы любоўны раман, дзе я зусім не ліхадзей. Я ваш любімы модны райтар. Так, мае інфантыльныя, няўпэўненыя ў сабе зумеры, не пісьменнік — райтар».

Але і Гумба іншы раз хлусіў сам сабе. Ён таксама быў зумерам, хоць сваё пакаленне недалюбліваў, часцей нават ставіўся да яго з пагардай — асабліва калі не пісалася. У такія моманты ў пошуках натхнення Гумба ішоў на Зыбіцкую, у любімую кавярню, дзе сядаў за барную стойку і некалькі гадзін здзекаваўся з барыста.

— Што ў нас тут? Так...— ён счытваў імя на бэйджы.— Насця, вы не будзеце супраць, калі я распавяду адну гісторыю?

Дзяўчына ветліва ўсміхалася пастаяннаму кліенту, а Гумбу выносіла ва ўспаміны.

— Мая першая сага прыйшла да мяне ў сне, ёй падзяліўся сапраўдны чараўнік, але імя сваё, прабачце, назваць забыўся. Так я аднаасобна стаў аўтарам крутой гісторыі ў цэлых пяць кніг. Ведаеце, Насця, пакуль пісаў, існаваў у аўтаматычным рэжыме: прачнуўся, устаў, паеў — і за ноўтбук. Часам забягаў да вас за лавандавым рафам, піў прыхапкам і выслізгваў да сябе. Для лепрэконаў я заўсёды пакідаў падарункі, і яны таксама не скупіліся: сто пяцьдзясят тысяч знакаў без прабелаў за пару гадзін — што можа быць прасцей? Я пісаў, пісаў, пісаў, не заўважаючы, калі заканчваліся снежнестудзені і пачыналіся красавікамаі. Я здаваў кнігі своечасова. Лепрэконаў, калі тыя стамляліся нашэптваць мне сюжэты, удала замяняў нашымі мясцовымі бажкамі. Я слаўна весяліўся з Хатнікам і Балотнікам. Насця, а вы ведаеце, хто такі Вазіла? А Кумяльган? Можа, Мара? Не? Вельмі шкада. А вось мне вядомы адзін чалавек... ці не зусім чалавек, у якога на ўсе гэтыя імёны вечны абанемент. Вы думаеце, перад вамі дзівак? Па вачах бачу, што так думаеце, але я не такі. Я пісьменнік, гэта значыць, райтар, і мне тэрмінова трэба пачаць пісаць, інакш са мной скасуюць кантракт. І тады... каму тады буду патрэбен?

Не знайшоўшы водгуку ў нязграбна ўсмешлівай Насці, якая не ведала, ці то паклікаць адміністратара, ці то ўжо пачынаць тэлефанаваць у міліцыю, Гумба плаціў за каву, пакідаючы шчодрыя чаявыя, і выходзіў з кавярні. Ішоў да Свіслачы, дзе сумна назіраў за групамі зумераў, якія захраснулі там у пошуку патрэбных, правільных вайбаў.

«Ды гары яно ўсё агнем! Мне неабходна сабрацца, каб пачаць і скончыць гэтую новую сагу. Пасля яе стану знакамітым на Поўначы, Захадзе і Поўдні. А, і на Усходзе таксама. Шанц выпадзе, нібы раса, і я яго не міну. Сёння ж складу неймаверны чарцёж звыклых слоў, запалю святло неразгаданых сусветаў, і ўсё скончыцца лепш, чым добра».

З гэтай пранізлівай амаль малітвай Гумба жыў кожны дзень, але натхненне так і не прыходзіла. Ён мучыўся дома, пакутаваў у кавярнях і на мінскіх вуліцах. Днём і ноччу. Бяссонніца зусім яго замучыла, ён піў снатворнае, якое не дапамагала.

Некалькі начэй запар Гумба ляжаў у ложку з расплюшчанымі вачыма, назіраючы, як за акном павольна прачынаецца Мінск.

«У ледзь прыадчыненыя дзверы пранікае святло».

Ён заплюшчваў вочы і ўяўляў перапоўненае ў ланчтайм знаёмае кафэ.

«За яго дзвярыма балбочуць і смачна ядуць катлеты з пюрэшкай, але мяне там няма».

Гумба пераставаў бачыць сябе ўсюды: дома, на вуліцах. Забываўся, як пачувацца, і пужаўся яшчэ больш.

«А што, калі гэта пройдзе і я разам з ім? Якое глупства, такое немагчыма.

# НАТАЛЛЯ ТАРАБЕШ



## Чарэшні вясны

Вершы

Тарабеш Наталля нарадзілася 4 мая 1973 года ў вёсцы Навасёлкі Ляхавіцкага раёна Брэсцкай вобласці. Скончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Працуе настаўнікам беларускай мовы і літаратуры ў Навасёлкаўскай сярэдняй школе. Вершы друкаваліся ў газетах «Заря» і «Ляхавіцкі веснік».

### Мой верш

За кожны радок я ўдзячная Богу.
Кладуцца яны, як часцінкі душы,
На аркуш бялюткі, нібыта ў дарогу
Рыхтуюцца ў нейкую ў гэтай цішы.

Яны мае радасці сціпла збіраюць,
Збіраюць і сум, і тужлівы настрой.
Яны за сабою спакой пакідаюць,
А цяжкае ўсё забіраюць з сабой.

Іх шлях быццам бачу я тут, на далоні.
Здаецца мне, кожны вось гэты радок,
Бы срэбрам, спадае з часамі на скроні,
Ён побач са мной і не зверне ўбок.

І, дадзены Богам, я верш свой збіраю.
Ён радасць мая, і мой смутак, і боль.
Яго назаўсёды ў душы захаваю:
У буру, у дождж, і у вецер, і ў золь.

### Стосік фотаздымкаў

Хачу спакою, дзесьці ён згубіўся:
Няўрымсліваю хуткаю хадой
Спяшае час, нібы куды спазніўся,
І крок штодзень прыспешвае ён свой.

Я падпішу апошні фотаздымак.
Хай будзе дзень, і месяц, ну і год.
І вось ужо глядзіш: нібыта дымам
Заслонены гадоў кругаварот.

А мне здаецца, што ён быў нядаўна,
Той міг, што фотаздымак захаваў.
Але жыццё змяніла непапраўна
Усё вакол і ход звычайных спраў.

У перамены тыя цяжка верыць
Бывае мне. Палёгкі не дае
Той час імклівы, зачыняе дзверы —
І адыходзяць блізкія мае.

# ЛІНА МРАГІ



## Простыя гісторыі з дзевяностых...

Мрагі Ліна (сапр. Мігаль Ірына) нарадзілася 18 лістапада 1975 года ў Мінску. Паэтка і празаік. Друкавалася ў рэспубліканскай перыёдыцы. Аўтар рамана-фэнтэзі «Для смаку дадаць кары, альбо Каталізатар для планеты» (2021).

### Дзядзька Сярожа

Калі я была маленькай, мае бацькі мелі сябра, які, зрэшты, і пасля доўга ім заставаўся. Ён з'яўляўся другім мужам блізкай мамінай сяброўкі, з ёй знаёмства адбылося ў радзільным доме, калі я паявілася на свет. Першы муж цёткі Волі трагічна загінуў, і за некалькі месяцаў да родаў яна ажанілася з дзядзькам Сярожам. І аб тым, што Воўка — з ім мы нарадзіліся літаральна з розніцай у суткі — не яго сын, я даведалася толькі ў дзесяць-адзінаццаць гадоў.

Нашы сем'і мелі шмат агульнага, як і многія іншыя ў той час. Але ж тады ўсё было падобна. Маладыя бацькі, дзеці аднаго ўзросту, каапературыўныя кватэры ў доўгім панэльным доме, проста ў розных яго канцах, ды і ўнутранае ўладкаванне тыповых двушак мала ў чым адрознівалася — усё стандартнае: люстры, кухні, мэбля, хрусталь, дываны...

Аднак адрозненняў усё ж хапала, і зараз яны здаюцца істотнымі. Калі мой бацька даволі доўга працаваў на адным прадпрыемстве, дзядзька Сярожа, маючы кіроўчыя правы ўсіх магчымых катэгорый, не сядзеў на месцы, хаця ўласны аўтамабіль у яго чамусьці не атрымлівалася купіць: то на адной машыне ўсіх нас у вёску да маміных бацькоў завязе, то на іншай, то на ЗІЛе ці, увогуле, на фуры прыедзе, а то і на таксі ці «мульціку» (каталіся тады па горадзе такія маленькія смешныя гэдээраўскія грузавічкі).

Яшчэ ён любіў музыку, а добрая музыка, асабліва замежная, у тыя гады татальнага дэфіцыту зусім немалых грошай каштавала, ды і паспрабуй дастаць. Але ў дзядзькі Сярожы і бабіннік меўся шыкоўны, і калонкі высокія, масіўныя такія, ад іх гуку сцены дрыжалі ледзь не да дзявятага паверха. Мае бацькі такія траты не ўхвалялі, хаця на ўсялякія святы і дні нараджэння пад такую музыку танцавалі з

задавальненнем, але што тут скажаш, яны маладыя, дзеці маленькія...

Ішоў час, нашы сем'і сябравалі, выпівалі — не без гэтага. У сем гадоў у мяне паявіўся малодшы брат, мама пайшла ў дэкрэт, а я ў школу. Потым і брацік да першага класа дарос, а я стала заўважаць: зносіны мамы і цёткі Волі паступова пачалі псавацца. То яны з бацькам нешта бурна абмяркоўваюць за зачыненымі дзвярыма пасля сумесных сустрэч, то да тэлефона не падыходзяць, калі іх сяброўка тэлефануе. З аднаго боку, распірала цікавасць, што там у іх адбываецца, а з іншага — неяк і не, бо гэта не мае сябры, яны дарослыя, хай самі разбіраюцца, у мяне і сваіх спраў хапае: усякія гурткі, секцыі, экскурсіі з класам, бібліятэкі (я хадзіла адразу ў тры), ды і ўрокі з малодшым братам адымалі час, бацькам жа не было калі, яны на працу ходзяць, а я ўсё гэта сама нядаўна праходзіла — так яны аргументавалі.

Неяк пад канец навучальнага года — я заканчвала дзявяты клас — трэнер маёй каманды па валейболе паведаміла: узнікла магчымасць на цэлы месяц паехаць у Крым у спартыўна-працоўны лагер, трэба толькі да канца тыдня здаць дваццаць пяць рублёў на білеты — і ўсё. Жыллё і трохразовае харчаванне забяспечана. Праца па чатыры гадзіны ў будныя дні ў саўгасных садах на зборы чарэшні і персікаў, якія да таго ж і есці можна колькі ўлезе, а ўвесь астатні час — мора, пляж, што вельмі блізка, і экскурсіі ў курортныя гарады па выхадных. Як жа я хацела паехаць! Мора... Ніколі яго не бачыла!

Усе гэтыя гады мой летні адпачынак складаўся з поўзання па агародзе ў бабулі ў вёсцы, кармлення курэй ды трусаў, паходаў у ягады і грыбы, а тут мора... карацей, самі разумееце. Вось толькі, ідучы дадому з трэніроўкі, я ўжо прадбачыла адказ бацькі: «Але ж мы яшчэ кааператыў плацім!» Гэта бясконцая і адзіная адгаворка даўно нагнала аскому, хаця мне чамусьці казалася, справа заключалася не толькі ў гэтым. Усе мае захапленні, акрамя школы, заўсёды разглядаліся праз прызму: «А колькі плаціць? Не, гэта дорага»,— так бацька казаў. І на рэдкія пярэчанні маці адказ таксама быў аднолькавы: «Яна дватры разы сходзіць — і ўсё, а грошы наперад трэба...» Таму да старэйшай школы пра тое, што патрабавала дадатковых расходаў, я ўжо не заікалася, хадзіла на ўсё бясплатнае. А тут дваццаць пяць рублёў, ды і да канца тыдня. Увогуле, надзея ледзь цяплілася.

Адчыніўшы дзверы, я зразумела: у нас госці. Чыесьці начышчаныя вастраносыя туфлі стаялі каля парога. Бацька такія не насіў.

— Прывітанне, Шурык! — дзядзька Сярожа зухавата ўсміхнуўся і падміргнуў.— А вырасла як! Ну нявеста!

— Здрасьце...— буркнула я. Разумеючы, што зараз, напэўна, прыдатны момант: на стале — пачатая бутэлька, закуска, усе добрыя і вясёлыя,— выдала, ледзь не плачучы, і пра лагер, і пра мора, і пра персікі, ну і пра грошы, канешне.

— Колькі? — бацька аж падскочыў.— Чацвяртак?!

А мама, якая мітусілася каля пліты, штосьці дасмажваючы, адразу падліла масла ў агонь:

— Куды? На цэлы месяц? А хто вас там даглядаць будзе?! Хто з дарослых вас павязе? А жыць вы дзе будзеце? А харчавацца як?! Гэта ж цягніком двое сутак трэсціся! Ні ў якім разе! Я невядома з кім і куды сваё дзіця не адпраўлю! Усё! Ідзі ўрокі рабі!

— Канец года, ужо амаль нічога не задаюць... Забыліся, ці што...— Я стаяла пасярод кухні, ужо канкрэтна хлюпаючы носам.

Усю гэтую сцэну дзядзька Сярожа назіраў моўчкі. А потым раптам зірнуў, дзіўна так, спачатку на бацьку, потым на маці, і палез ва ўнутраную кішэнь, дастаючы тоўсты пачак, перацягнуты гумкай,— столькі грошай за раз я яшчэ ніколі не бачыла.

— Значыць, так, Аляксандра... Гэта табе на білеты, — і першая хрумсткая фіялетавая паперка легла на стол паміж кілішкамі і салатам,— а гэта...— другая такая ж зашалясцела зверху,— на кішэнныя расходы ў дарозе. На поўдзень усё-такі едзеш!

# ВАЛЕРЫЙ ПАЗНЯК



## Хай доўжыцца змярканне

Вершы

Пазняк Валерый нарадзіўся 23 чэрвеня 1947 года ў вёсцы Папкі на мяжы Дзяржынскага і Стаўбцоўскага раёнаў Мінскай вобласці. Вучыўся ў політэхнічным тэхнікуме, скончыў філалагічны факультэт БДУ. Працаваў тэхнікам-электрыкам, настаўнікам беларускай і рускай моў і літаратуры, выкладчыкам-метадыстам у Манголіі і Афганістане, дырэктарам школы, у Нацыянальным інстытуце адукацыі. У розны час вершы друкаваліся на старонках газет «Чырвоная змена», «Настаўніцкая газета», «Літаратура і мастацтва», у часопісах «Полымя», «Нёман», «Новая Немига литературная». Аўтар зборнікаў паэзіі «Родны бераг», «Узмах буслінага крыла», «Іду па роднае зямлі», «З трывогай і з надзеяй», «У маёй нягучнай песні...».

### Давай пасеем жыта

Гады, гады пражыты...
Стаў дом бацькоўскі дачным.
Давай пасеем жыта
І хлеб духмяны, смачны,

Што на кляновым лісці,
Спячом, як колісь мама.
Сяброў сваіх паклічам
Надзейных, верных самых.

Хаця іх так нямнога
На гэтым белым свеце —
Ля роднага парога
Яшчэ кагосьці стрэцім.

Такое частаванне
Захоча кожны зведаць.
Да самага да рання
Няхай цячэ бяседа

Аб тым, што пражыта,
Што — жыць і спадзявацца...
Давай пасеем жыта,
Каб разам нам сабрацца.

### Гром

Ад ранку парыць, цяжка дыхаць,
Пот ручаём,
І ты ўжо прагна ловіш слыхам
Далёкі гром.

Пакуль не надта ён ахвочы
Грымець дарэмна, без пары,
Пакуль нягучна ён вуркоча,
Бы камень коціцца з гары.

Закрые неба раптам хмара,
Дзе ён таіўся...
І тады
На моц усю ён грозна ўдарыць,
Вясновы, дужы, малады.

Як салавей-разбойнік, вецер
Засвішча ў прыцемках прысад.

# НАТАЛЛЯ КАНСТАНЦІНАВА



## Падказка кававай гушчы

Апавяданне

Канстанцінава Наталля нарадзілася 16 ліпеня 1972 года ў Мінску. Скончыла факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Працуе карэспандэнтам часопіса «Адукацыя Міншчыны». Творы друкаваліся ў часопісах «Маладосць», «Полымя», «Нёман», «Новая Няміга літаратурная», «Белая вежа», «Метаморфозы», у газеце «Літаратура і мастацтва», калектыўным зборніку «Скажы, што кахаю…» і міжнародным зборніку «Ніць» Еўразійскай творчай гільдыі (Лондан). Лаўрэат конкурсу вострасюжэтнага апавядання Саюза пісьменнікаў Беларусі (2022), літаратурнай прэміі імя Івана Шамякіна (2025). Аўтар зборніка вострасюжэтнай псіхалагічнай прозы «Смена пароляў».

Аўтар удзячная барыста Іллі за інфармацыю, выкарыстаную пры напісанні апавядання.

Сапраўдны смак кавы Мікіта пачаў шукаць пасля трох гадоў працы барыста. Раней аддаваў перавагу, як яму здавалася, самым цікавым напоям. Салодкім, з рознымі дабаўкамі, буйнымі порцыямі. Любімым варыянтам быў вялікі латэ са ўзбітымі вяршкамі і ажынавым сіропам.

Але, калі сам стаў прафесійна гатаваць розныя віды кавы, магія наварочаных напояў для яго рассеялася. З'явілася ныючае неадчэпнае жаданне знайсці яго чысты смак — за ўсімі рафамі, капучына, флэт-уайтамі, мока і іншымі гурманскімі вынаходніцтвамі.

Таму ў вольны ад працы час Мікіта хадзіў па кававых крамках і замаўляў двайны эспрэса — маленькую порцыю самага моцнага напою, дзе раскрываецца поўны смак зерня. Вядома, допіа (як яшчэ называюць двайны эспрэса) ён піў і на сваім працоўным месцы. Але пасля некалькіх разоў дасканала вывучыў яго сваімі смакавымі рэцэптарамі. Бо пастаўшчык зерня і сорт не змяняліся. Так што даследніцкія дэгустацыі працягнуліся за межамі роднай кавярні.

Першы час у чужых кававых крамках ён не мог утрымацца, каб не ўставіць свае пяць капеек. Лічыў сябе карыфеем і павучаў іншых барыста, як правільна варыць каву. Але пасля некалькіх гарачых і зацяжных спрэчак, да таго ж марных, вырашыў моўчкі рабіць свае высновы. У розных кавярнях у двайным эспрэса адчуваліся ноткі карамелі, вішні, мускатнага арэха, хлеба… Мікіта так і не вырашыў, які з гэтых смакаў можна лічыць самым-самым чыста кававым. Па сутнасці, гэта заставалася для яго няўлоўнай прыгажосцю.

Мікіта меў адукацыю кухара. Пасля заканчэння каледжа ўладкаваўся ў дастаткова дарагі рэстаран. Але хутка зразумеў:

ІНТЭРВ'Ю

# ВЯЧАСЛАЎ НІКІФАРАЎ:

## «Штучны інтэлект — гэта востры меч, які кінулі ў натоўп»



*«Творчасць прадугледжвае ўнутраную свабоду. Ты робішся такім рэжысёрам, якім цябе зробіць твой характар, твая асоба, гэта не схаваеш», — так у гутарцы са мною аднойчы сказаў гэты Майстар.*

*Ён мае права так гаварыць. Яго фільмы запамінаюцца адразу... «Зімародак», «Хлеб пахне порахам», «Фруза», «Бацькі і дзеці», «Высакародны разбойнік Уладзімір Дуброўскі», «Душа мая, Марыя»... Легендарныя стужкі, якія ўвайшлі ў гісторыю. Лаўрэат дзяржаўнай прэміі СССР, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі Вячаслаў Нікіфараў шмат гадоў працуе на беларускай культурнай пляцоўцы, хоць нарадзіўся не тут... Але карэнні ў яго, аказваецца, ёсць і беларускія — дзядуля па маці Георгій Уладзіміравіч Курт нарадзіўся на нашай зямлі.*

*Вось з гэтага дзядулі, пра якога няшмат вядома, і пачалася наша чарговая гутарка — на гэты раз у скверыку ля кінатэатра «Беларусь». Вячаслаў Аляксандравіч расшукваў паходжанне прозвішча свайго дзеда: Курт на угра-фінскіх мовах, аказваецца, значыць «воўк». Вось ужо і сюжэт.... Можа, і для кіно? А кіно — тэма балючая і няпростая, бо праблем у беларускага кінематографа на сёння хапае. Ці ёсць моладзь, якая здатная стварыць новае беларускае кіно на тым узроўні, які задалі класікі кінематографа?*

*Вячаслаў Аляксандравіч успомніў сваю прапанову колішняму рэктару Беларускай акадэміі мастацтваў Рычарду Смольскаму: выбраць у Беларусі сярод студэнтаў-акцёраў дзесяць самых прыгожых хлопцаў і дзесяць самых прыгожых дзяўчат, навучыць іх усяму, ад адзінаборстваў да бальных танцаў, раскруціць, і каб яны былі нарасхват не толькі ў нас у Еўропе, але ва ўсім свеце. Каб яны стваралі партрэт, імідж Беларусі.*

***— Тады, можа быць, трэба пачынаць выхоўваць будучых творцаў не са студэнтаў, а яшчэ са школьнікаў, як у музыцы? Вунь як у Карэі існуюць школы трэйні, дзе выхоўваюць жорсткімі метадамі будучых айдалаў для шоу-бізнесу... А з другога боку, колькі талентаў прыйшло ў кіно параўнаўча позна, калі ўжо адбыліся як асобы. У Літаратурны інстытут імя Горкага, дзе я вучылася, прымалі толькі пасля двух гадоў працоўнага стажу, прычым не вучобы на філфаку ці журфаку, а менавіта працы на вытворчасці: лічылася, што малады чалавек, які не паспытаў жыцця, не можа і напісаць штосьці сталае, у яго няма неабходнага досведу. Я нядаўна абмяркоўвала з вядомым дырыжорам, паважаным маэстра Аляксандрам Анісімавым тэму вундэркіндаў у музыцы... Але ж у кіно гэтая тэма таксама балючая! СМІ любяць публікаваць гэткія расследаванні — лёсы колішніх дзяцей-кіназорак... І вельмі рэдка тыя лёсы складваюцца шчасліва.***

— Былі і на маёй здымачнай пляцоўцы вундэркінды... Галоўнага героя апошняга майго фільма «Тум-пабі-дум», дзесяцігадовага хлопчыка, знайшлі ў Адэсе. Я ўбачыў яго ў перадачы тыпу «Ало, мы шукаем таленты». Уключаю тэлевізар — і хлопчык чытае маналог дзетдомаўца... А ў маім фільме якраз герой дзетдомавец. Я ўразіўся. І грамадзянскі пафас, і эмоцыі, і драма... Цяжка апісаць. Нешараговыя дзеці — іх заўсёды цяжка апісаць, заўважалі? Хаця дзеці ж ад пачатку геніяльныя, як геніяльная сама прырода. Не, прырода — гэта норма, а геніяльнасць — па-за нормай. Дык вось, так Арцёма мы і знайшлі. Сыграў геніяльна, але што з ім цяпер, не ведаю. У фільме «Зімародак», знятым у 1972 годзе, іграла трынаццацігадовая Ірачка Нарбекава. Сёння яна заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь. Падтрымліваем з ёй кантакты, вельмі шаную яе. Нячаеўскі Дзіма Іосіфаў, які сыграў Бураціна, зрабіўся някепскім рэжысёрам...

***— Чытала, адзін рэжысёр так выбіраў дзяцей на ролі: яны па адным заходзілі ў кабінет, кожнага прасілі стукнуць па стале. Усе паслухмяна стукалі... Нарэшце адзін на загад «Стукні па стале» сказаў: «Навошта?» О, нарэшце трапіўся той, хто думае! Самае то для кіно! Вы кажаце — усе дзеці таленавітыя... А чаму з іх вырастаюць бяздарныя дарослыя?***

— У мяне таксама былі думаючыя дзеці на здымачнай пляцоўцы. І ў «Вялікіх прыгодах», і ў «Ціхіх троечніках», і ў «Зімародку»... Так, дзеці ад пачатку маюць талент да акцёрскай прафесіі. Тысячагадовая навука мімікрыраваць, прыстасоўвацца, лісліваць ператвараецца ва ўстойлівае ўменне. Відачынства, «ліцадзейства» — самая старажытная прафесія. Вось, першабытныя часы... Сядзім мы ў пячоры... Нуда смяротная... Маманты звонку... І нейкі дзівачына пяе, прытанцоўвае. Дык яму цаны няма! Вось што такое відачынец — яшчэ з пячорных часоў! Пры пэўных намаганнях можна ў кожным дарослым абудзіць здольнасць да акцёрства. Гэта і ў фільмах неарэалізму выкарыстоўвалі, італьянскія рэжысёры любілі здымаць непрафесіянальных актораў. І я здымаў, няшмат, праўда. Проста часам з імі трэба так важдацца, што гэта будзе нерацыянальна. Кант сказаў, што геній — гэта прыроджаная здольнасць душы, пры дапамозе якой прырода дае мастацтву правілы. Гэта той выпадак, калі мы гаворым — вось, як быццам нехта водзіць маёй рукой з пяром ці пэндзлем. Момант, калі з цябе проста плыве натхненне... Вундэркінд — той, у каго гэтая ўласцівасць душы развітая, і ён сам не ведае, як у яго атрымліваецца.

***— Станіслаўскі казаў, што немагчыма іграць на адной сцэне з жывёламі і дзецьмі... Яны цябе ўсё адно перайграюць, бо прыцягнуць увагу і будуць больш натуральнымі. Сёння чалавек з дзяцінства развучваецца быць сабой. Facebook, Instagram, TikTok... Дзеці вучацца здымаць ролікі, у якіх іграюць на публіку, абы атрымаць пабольш лайкаў. Выконваюць флэшмобы, якія часта вельмі небяспечныя... Вам не здаецца, што сёння паняцце прафесійнага кіно проста знікае? Кожны сам сабе артыст, сам сабе рэжысёр... На фестывалях часта з'яўляюцца фільмы, знятыя людзьмі, якія не маюць спецыяльнай падрыхтоўкі. Фільмы, якія здымаюць на непрафесійную апаратуру — ды проста на смартфон...***

— Гэта не з'ява часу, не прыкмета менавіта цяперашняга пакалення. Гэта тысячагадовы «ліцадзейскі» людскі досвед, гены... Проста зараз гэта абудзілася. Памятаю, у дзяцінстве мы ішлі чарадою з кіно і я распавядаў убачанае прыяцелям — і не проста распавядаў, а іграў у асобах: «А вось ён так, а памятаеш, ён гэтак, а ён бяжыць, бяжыць, а побач узрываецца...» Чуў у адказ: «Ды ладна, мы, ціпа, бачылі...» А самі з задавальненнем пражываюць сюжэт зноў і зноў. То бок мне хацелася ўбачанае на экране паўтарыць, увасобіць, рэстаўраваць... Але я такі быў адзін, у сяброў меліся іншыя інтарэсы. У нашай кампаніі знаходзіўся адзін паэт — хлопчык дробны, далікатны, з вельмі беднай сям'і... А другі з космасу.